# ГАРЫЗОНТЫ ГЕНРЫХА МЫСЛІЎЦА

## Старажыл аграбізнесу забяспечвае ўвесь Мастоўскі раён агароднінай

**І ў гэтым далёка не камерцыйны інтарэс фермерскай гаспадаркі «Гарызонт». Сваю прадукцыю фермер пастаўляе ў школы і садкі бясплатна. Дапамагае агароднінай і бульбай Жыровіцкаму манастыру.**
**Як вопытны вытворца, Генрых Мыслівец паглыбляе сваю дзейнасць — не толькі вырошчвае, але і займаецца перапрацоўкай агародніны. Лічыць, што толькі свае, беларускія, інвестары здольны вывесці сельскую гаспадарку на новы ўзровень.**



### Моцны гаспадар і мецэнат

Са старшынёй райсавета Валерыем Табалой пад'язджаем да вытворчага комплексу фермерскай гаспадаркі «Гарызонт», што каля вёскі Пладовая. Вакол — наколькі хапае вока — узараная ралля. Гэтыя землі раней належалі двум калгасам, тлумачыць Валерый Іванавіч. Паступова ад кожнага частка перайшла да фермера Генрыха Мысліўца, які вырошчвае гародніну і бульбу. Аб тым, што зямля трапіла ў рукі гаспадара, сведчыць і валавы збор, і ўраджайнасць. Яна, дарэчы, вышэйшая, чым у сярэднім па раёне. Што датычыцца аб'ёмаў, фермер вырошчвае амаль усю агародніну раёна (98 %) і трэцюю частку бульбы (31 %).

Падчас нашага прыезду гружаны бульбай самазвал якраз быў гатовы да выезду. Гэта некандыцыйная прадукцыя накіроўвалася на крухмальны завод. А вось таварная праходзіць праз лінію ўпакоўкі і адпраўляецца ў розныя бакі — ад мясцовых супермаркетаў да замежных спажыўцоў. Напрыклад, у Малдову. Так ідуць справы і з агароднінай — морквай, буракамі, капустай, цыбуляй. Але фермер не толькі працуе дзеля прыбытку, ён забяспечвае сваёй прадукцыяй школы, дзіцячыя садкі, што дазваляе зрабіць харчаванне ў іх больш танным.

### Вырашыў і зрабіў

Менавіта так можна вызначыць шлях Генрыха Мысліўца ў фермерскай справе. Пайсці на «свой хлеб» ён вырашыў у пачатку 90-х, як толькі з'явіўся закон аб фермерскай гаспадарцы. Згодна з ім пачалося крэдытаванне на закупку тэхнікі. Праўда, на месцах спачатку не ведалі, як гэту тэхніку рэгістраваць, і наогул глядзелі на яго падазрона. Але Мыслівец не здаўся. І ўжо на першых 10 гектарах, дзе пасадзіў бульбу і цукровыя буракі, даказаў, што фермер здольны працаваць рэнтабельна і якасна.

Па вырошчванні агародніны фермерская гаспадарка «Гарызонт» з'яўляецца самой буйной ва ўсім Гродзенскім рэгіёне. Цяпер у Мысліўца 720 гектараў ворнай зямлі, гэта палова сярэдняга калгаса ў раёне. У наяўнасці — сучасная тэхніка, аўтарэфрыжэратары, лініі расфасоўкі і ўпакоўкі агародніны. Не так даўно тут пачалі займацца выпускам паўфабрыкатаў у вакуумнай упакоўцы. Робяць салаты, квасяць капусту. Дарэчы, попыт на капусту расце. Таму закваска вядзецца пастаянна. Прадукцыю развозяць як па раёне, так і па вобласці. Летась у вёсцы Пладовая адкрылі сваю краму. У планах — наладзіць замарозку агародніны.

### Айчынны вытворца патрабуе ўвагі

Тэхналагічны ланцужок, на думку фермера, мера вымушаная. Шматпрофільнасць характэрная для агрaхолдынгаў, а вось малыя гаспадаркі павінны мець вузкую спецыялізацыю.

— Адзін павінен вырошчваць, другі — перапрацоўваць, хтосьці прадаваць, — лічыць Генрых Валяр'янавіч. — Кожны займаецца сваёй справай і ўдасканальвае яе. Але для гэтага патрэбны адпаведныя вытворцы, якія ішлі б у аграбізнес, прычым нашы, беларускія.

Магчымасці для гэтага ёсць. Для закупкі тэхнікі існуюць лізінгавыя праграмы. Але варта зацікавіць менавіта сваіх інвестараў, якія выраслі на гэтай зямлі. Яго, як вытворцу і дэпутата абласнога савета, клапоціць стан айчыннага рынку.

— Сёння рынак адкрыты для ўсіх. І часта прыходзяць не толькі правераныя вытворцы, але і фірмы-аднадзёнкі, якім важна атрымаць імгненны звышпрыбытак, — адзначае фермер. — Таму вельмі важна абараніць айчынных вытворцаў, якія працуюць на якасць. Каб яны мелі доўгатэрміновыя кантракты і сістэму дагавораў. Інакш кажучы — стабільныя ўмовы работы.

Генрых Валяр'янавіч прыводзіць прыклад работы расійскага фермера, які прыязджаў да яго з Калінінграда. Там фермерам даюць крэдыты пад 3—5 % гадавых для развіцця сельскай гаспадаркі. Гэта дазваляе адразу набыць увесь камплект неабходнай тэхнікі і апрацоўваць вялікія аб'ёмы.

— Цяпер Расія насычае свой рынак уласнай прадукцыяй — бульбай, яблыкамі... І вельмі жорстка адсочваецца, каб нічога не завозілася, каб менавіта свая прадукцыя знаходзіла збыт. Такая ж сітуацыя і ў Еўропе. Нават сёлета, калі там быў дэфіцыт бульбы, прадаць туды беларускую прадукцыю было немагчыма. Я адпраўляў чырвонакачанную капусту, якая не мае ў нас асаблівага попыту, — заўважыў Генрых Мыслівец.

### Ці заменіць фермер калгас?

Пакуль пытанне не стаіць так востра. Тым не менш вопыт паспяховых фермерскіх гаспадарак вывучаецца. Аб іх значнасці сведчыць і наведванне фермера урадавай дэлегацыяй на чале з прэм'ер-міністрам у 2017 годзе. І зараз ідзе гаворка аб тым, каб прыцягнуць інвестараў да рэструктурызацыі неэфектыўных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Не сакрэт, што зараз нямала калгасаў, якія знаходзяцца ў працэсе санацыі, гэта значыць могуць стаць банкрутамі. Генрых Мыслівец такой перспектывы для сябе не ўяўляе. З году ў год ён толькі ўдасканальвае вытворчасць і нават гатовы пашырыць свае плошчы.

Дарэчы, у фермерскай гаспадарцы працуе больш за 40 чалавек. І ахвотных хапае. Гэта сведчыць аб тым, што рынак працы ёсць. Як адзначыў старшыня райсавета Валерый Табала, добрым стымулам для развіцця вёскі можа стаць магчымасць прадаваць уласную прадукцыю. Гэта дазволіць мець свае традыцыі ці адрадзіць тыя, якія страчаны, напрыклад, па вырабе сыроў, выпечцы караваяў альбо проста нейкіх страў, якія добра атрымліваюцца ў мясцовых гаспадынь. Ад такога падворка можа ўзнікнуць і фермерская гаспадарка. Дарэчы, цяпер у Мастоўскім раёне налічваецца 30 фермераў, і гэта нямала. Некаторыя развіваюць аграсядзібы. Ёсць такія планы і ў Генрыха Мысліўца. А яшчэ — завесці невялічкую ферму, каб зрабіць вытворчасць безадходнай. Пасці сваіх каровак ён марыць на полі, непадалёку ад ракі.

— Паглядзіце ў акно, гэта пойма ракі, там трава ў пояс, раней пасліся 300 кароў з нашых вёсак, мы туды пусцім статак, гэта і будзе вяртанне традыцый, — кажа Генрых Валяр'янавіч.

Але пакуль яго больш хвалююць надзённыя праблемы. Вось-вось пачнецца сяўба. Фермер ужо вызначыўся з плошчай і культурамі, дарэчы, ён усё актыўней пераходзіць на арганічнае земляробства. Амаль палова бульбяных палеткаў вырошчваецца без выкарыстання гербіцыдаў. Мастоўскі фермер гатовы яшчэ прыдбаць зямлі і вырошчваць сваю агародніну і бульбу.

— Каб не везлі з Галандыі ці яшчэ адкуль, — зазначае ён. — Будзе зямля — і мы забяспечым сваёй прадукцыяй беларусаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**



Пасля «Вялікай размовы»

# САДОК ПОБАЧ З ДОМАМ

**Падчас акцыі «Задай пытанне Прэзідэнту» ліст напісала Вікторыя Зыковіч з Брэста. Мама дваіх дзяцей станоўча ацаніла работу, якая вядзецца па падрыхтоўцы горада да 1000-годдзя. Але, на яе думку, новыя масты, дарогі, іншыя грамадскія аб'екты не вырашаць праблему многіх і многіх бацькоў дашкольнікаў, таму трэба яшчэ будаваць садкі. «Я пражываю ў мікраераёне Кавалёва, працую ў гэтым жа раёне, — піша аўтар звароту, — а дзіця вымушаная вазіць у другі раён — Усход. Хоць побач з маім домам па вуліцы Луцкай размешчаны тры дзіцячыя садкі».**

Далей жанчына апісвае, як звярталася ў аддзел адукацыі Маскоўскага раёна Брэста перад уладкаваннем дзіцяці ў садок, як ёй адмовілі. З часам прасіла ўжо перавесці дачку з садка на Усходзе ва ўстанову бліжэй да дому, зноў атрымала адмоўны адказ па прычыне адсутнасці месцаў. «Як можна думаць пра павелічэнне сям'і, калі і другое дзіця не магу ўладкаваць у садок побач з домам?!» — задаецца рытарычным пытаннем жыхарка Брэста.

Аўтар гэтых радкоў таксама жыве ў мікраераёне Кавалёва па вуліцы Луцкай. Магу сказаць, што і дваццаць гадоў таму праблема ўладкавання ў садок крокавай даступнасці была — не такой вострай, як цяпер, але была. Мікрараён адносна малады. Вікторыя кажа аб трох дашкольных установах, якія відаць з вокнаў яе кватэры. Насамрэч іх чатыры, хіба што садок № 82 на пяць хвілін хадзьбы далей ад згаданых трох, якія знаходзяцца фактычна ў адным квартале. Але ж за апошнія два дзесяцігоддзі навакол пабудавана столькі жылля, што месцаў сапраўды стала катастрафічна не хапаць. А цераз дарогу ад кварталаў забудовы вакол вуліцы Луцкай на вачах расце яшчэ адзін мікрараён пад назвай Лагуна.

— Вось тут і ўзводзіцца школа-садок на 471 месца, у тым ліку на 150 дашкольных, — паведаміў **начальнік аддзела адукацыі Брэсцкага гарвыканкама Анатоль НАСКОЎ.** — Зараз у дашкольных установах горада займаецца 17 тысяч дзяцей. Праблема дэфіцыту месцаў у садках узнікла не ўчора. Горад імкнецца яе вырашаць рознымі шляхамі. Калі чатыры гады таму не хапала дзве з паловай тысячы месцаў, то цяпер дэфіцыт складае каля дзвюх соцень. І гэты разрыў скараціўся таму, што апошнім часам уведзена ў эксплуатацыю больш за 3,5 тысячы месцаў. Па-першае, павялічвалі напаўняльнасць дашкольных груп, а па-другое рамантавалі і вярталі памяшканні, якія раней былі дзіцячымі садкамі, а потым перадаваліся ў іншыя ведамствы. Напрыклад, дзіцячы садок на 350 месцаў па вуліцы Благавешчанскага не так даўно ўвялі ў строй, цяпер там уладкавана больш за 400 дзяцей, атрымалася размясціць дадатковыя месцы. Па вуліцы генерала Ракасоўскага плануецца правесці рэканструкцыю садка і таксама павялічыць колькасць дашкольных месцаў. Пачынаюцца праектныя работы па будаўніцтве садка ў мікраераёне Вулька-3. Гэта суседнія раёны з памянёным Кавалёвам. Значыць, можна спадзявацца, што ў раёне пражывання Вікторыі Зыковіч садкі будуць патроху разгружацца.

А пакуль заяўніцы паабяцалі вярнуцца да пытання восенню. Калі будзе праведзена камплектацыя груп на наступны навучальны год і застануцца месцы, яе дачку перавядуць у садок побач з домам.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Крокі да экалогіі

# СМЕЦЦЕ ПРЫНОСІЦЬ ПРЫБЫТАК

**У Наваполацку ёсць прадпрыемства, якое збірае і перапрацоўвае другасныя рэсурсы. Цікава, што першымі ў вобласці, другімі ў краіне тут пачалі ўсталёўваць заглыбленыя кантэйнеры для смецця, якія можна ўбачыць і ў ЕС. У Віцебскім аблвыканкаме, улічваючы добры вопыт Біямехзавода бытавых другасных рэсурсаў, даручылі прадпрыемству збіраць смецце і ў Полацкім раёне. Чым ужо і займаюцца. А ў найбліжэйшай перспектыве будуць рабіць гэта ў Расонскім і Ушацкім раёнах. Тым больш што ёсць нагода — стварэнне першага міжраённага палігона для цвёрдых бытавых адходаў. Яшчэ больш цікава, што, акрамя вырабу пластыкавых «паўфабрыкатаў», у Наваполацку з другасных рэсурсаў навучыліся рабіць тратуарную плітку і бардзюр.**



Выконваючы абавязкі дырэктара вытворчага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Біямехзавод бытавых другасных рэсурсаў» Сяргей ВЯЛЮГА.

На вытворчым камунальным унітарным прадпрыемстве цікавы вопыт для пераймання напярэдадні Дня камунальніка вывучаў наш карэспандэнт.

### Карысныя бактэрыі

У Наваполацку, адным з самых маладых гарадоў краіны, зборам смецця займаюцца дзве арганізацыі. Спецаўтабаза адказвае за чысціню каля гарадскіх аўтадарог і ў парках, скверах — усюды па-за дварамі. І плюс — смеццевы палігон знаходзіцца на іх балансе. А прадпрыемства «Біямехзавод бытавых другасных рэсурсаў» збірае цвёрдыя бытавыя адходы ў жылым сектары. Абслугоўвае таксама юрыдычных асоб.

— Стварэнне завода пачалося ў 2003-м. Тады ў Беларусі яшчэ абмяркоўвалі неабходнасць збору другасных матэрыяльных рэсурсаў. Доўгі час заняло будаўніцтва нашага прадпрыемства — на базе будынкаў (фактычна каркасаў) вучэбна-вытворчага комплексу былога будаўнічага трэста. Далей было набыццё, запуск неабходнага абсталявання. Фінансаванне вялося з гарадскога бюджэту пры падтрымцы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, — расказвае **выконваючы абавязкі дырэктара вытворчага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Біямехзавод бытавых другасных рэсурсаў» Сяргей ВЯЛЮГА.**

Фактычна завод увялі ў эксплуатацыю ў снежні 2010-га. Тады і пачаліся збор, вываз цвёрдых камунальных адходаў на завод для сартавання і біямеханічнай апрацоўкі. Пасля сартавання пластмасы ў спецыяльным сховішчы бактэрыі з'ядаюць арганічную частку смецця. Дарэчы, арганіка пасля «апрацоўкі» бактэрыямі — кампаставаная сыравіна, прыдатная для абвалавання і перасыпкі на палігоне слаёў цвёрдых камунальных адходаў.

### Як у Еўропе

— У 2017-м мы засвоілі новы метад захоўвання камунальных адходаў, калі быў усталяваны першы заглыблены кантэйнер. На сёння ў горадзе каля пяцідзесяці заглыбленых кантэйнераў і больш за дваццаць наземных. Апошнія знешне не адрозніваюцца ад «сабратаў». Толькі аб'ём меншы — тры «кубы», а падземнага — пяць метраў кубічных. Іх усталёўваем там, дзе ёсць складанасці з правядзеннем падземных работ з-за камунікацый. Кантэйнеры вырабляюцца ў Беларусі і Расіі. Усе выкарыстаныя матэрыялы, тэхналогіі і абсталяванне адпавядаюць сучасным еўрапейскім узорам. Корпус кантэйнера мае суцэльналітую канструкцыю і зроблены з трывалага поліэтылену, — працягвае кіраўнік прадпрыемства.



Пагрузка спрасаваных пластыкавых другасных рэсурсаў.

Фінансуецца ўсталяванне за кошт сродкаў дзяржаўнай праграмы, распрацаванай для камфортнага жылля, і нацыянальнага апературa другасных рэсурсаў.

Суразмоўца прызнаўся, што некаторым жыхарам спачатку не вельмі спадабалася новаўвядзенне. Скардзіліся, што нязручна адчыняць века кантэйнера, выказвалі асцярогу, што ўнутр можа ўпасці дзіця, пра верагоднасць пажару з-за, напрыклад, непагашанай цыгарэты...

З людзьмі праводзілі тлумачальную работу. І з часам навапалачане ацанілі зручнасць.

Цікава, дарэчы, назіраць, як «кішку» са смеццем дастаюць пры дапамозе крана і загружаюць новы «мех». Ёсць і кантэйнерныя «блокі», якія цалкам вывозяцца на платформах...

Вопыт вывучалі на месцы падчас калегіі Міністэрства ЖКГ і семінара для работнікаў сістэмы камунальнай гаспадаркі. Дарэчы, такі паказчык, як збіральнасць другасных матэрыяльных рэсурсаў, у Наваполацку самы высокі на Віцебшчыне — каля 42 кілаграмаў у год на чалавека. Працэнт адходаў, якія адбіраюцца з ДМР, — 18,4 %, на ўзроўні абласнога.

### КПП стацыянарныя і на колах

У Наваполацку завод арганізаваў і дзейнасць комплексных прыёмных пунктаў.

Цяпер у нафтаградзе пяць стацыянарных КПП, у тым ліку адзін — на тэрыторыі прадпрыемства. Ёсць і два перасоўныя, якія ездзяць у тым ліку па садаводчых таварыствах і гаражных кааператывах. Абслугоўваюць і Полацк. Прымаюць макулатуру: кардон, часопісы, газеты. Людзі ахвотна здаюць і поліэтыленавую плёнку, напрыклад, дачнікі, калі змяняюць на цяпліцах на новую. Купляюць і адходы шкла ў любым выглядзе. Пры гэтым, калі грамадзянін робіць сартаванне бутэлек па колеры, ён атрымлівае больш грошай.

— А вось ПЭТ-бутэлькі на КПП не прымаем: з-за вялікага аб'ёму няма месца для часовага захоўвання. Паўтаруся, гараджане навучыліся дастаткова добра сартаваць іх у кантэйнеры для асобнага збору. Усяго па горадзе, акрамя згаданых, каля 1300 кантэйнераў — для асобнага збору другасных матэрыяльных рэсурсаў. І гэта на 107 тысяч насельніцтва.

Прымаем адходы іншых пластмас. Напрыклад, розную тару. У прыватнасці, каробкі ад розных напояў. Нарыхтоўваем і каністры любога аб'ёму: ад алеяў да растваральнікаў.

Купляем і флакончыкі ад бытавой хіміі, харчовай прадукцыі. Ад кетчупаў, напрыклад, мыйных сродкаў, шампуню, касметыкі... Забіраем бытавую электронную і электрычную тэхніку: халадзільнікі, тэлевізары, газавыя пліты, пральныя машыны, фены, прасы і гэтак далей — усё, што ўтыкаецца ў разетку. Канешне, і за гэта плацім, на вуліцу толькі трэба вынесці, — канстатуе суразмоўнік.

### На чатыры раёны...

Упершыню ў Віцебскай вобласці ствараецца міжрэгіянальны палігон для захоўвання смецця. Гэта дазволіць закрыць дзясяткі міні-палігонаў. Новы размесціцца пад Полацкам. Завод, акрамя Наваполацка і Полацкага раёна, будзе нарыхтоўваць сыравіну ў суседніх Расонскім і Ушацкім. Адпаведнае рашэнне прынялі ў Віцебскім аблвыканкаме. Выпадак унікальны.

— Гэта дазволіць аптымізаваць выдаткі, наладзіць больш эфектыўны збор смецця, адбор другасных матэрыяльных рэсурсаў. Летась разам з полацкім смеццем апрацавалі каля 220 тысяч кубоў. Прырост склаў прыблізна 80 працэнтаў. Пасля далучэння тэрыторый яшчэ двух раёнаў выйдзем на аб'ём больш за 500 тысяч кубаметраў у год. Павелічэнне дазволіць на поўную загрузіць прадпрыемства сыравінай, — разважае Сяргей Вялюга.

Канешне, арганізацыі, якая раней абслугоўвала малады горад, цяжкавата працаваць у нязвыклых абставінах, на мясцовасці, якая яшчэ не вельмі дастаткова вывучана. Бывае, людзі скардзяцца на тое, што нясвоечасова вывозяць смецце. Але выконваючы абавязкі кіраўніка ўпэўнены, што з часам усё наладзіцца.

— У Наваполацку, напрыклад, няма прыватнага сектара, у Полацку — наадварот, такога жылля нямала. Плюс там ёсць аднакватэрныя і двухпавярховыя дамы, дзе нязручна аказваць паслугу па вывазе цвёрдых камунальных адходаў.

Там, дзе вузкія вуліцы, не ўсюды могуць праехаць аўто для зборкі смецця з так званай задняй загрузкай. Усяго, дарэчы, у нас разам з полацкімі машынамі, якія нам перадалі, больш за 40 грузавікоў спецыяльнага прызначэння. Ёсць шмат сучасных смеццявозаў і звычайныя параўнальна невялікія па габарытах МАЗы. У Полацкім раёне, які нам перадалі для абслугоўвання, больш за 400 вёсак. Сярод іх каля 40 — ужо нежылыя. Больш за сто — да 10 чалавек і больш... Усё давялося арганізоўваць пановаму — пад сваю спецыфіку. Працэс станаўлення не скончаны, ды яшчэ паралельна прыйдзецца вывучаць два згаданыя раёны, — працягвае кіраўнік.

### «Элементы гарадскога дэкору»

Тут вырабляюць так званую пластыкавую флексу, якую прадаюць у Беларусі і на экспарт у Расію — да 20 тон у месяц, — для перапрацоўкі і вытворчасці новых вырабаў.

Робяць на заводзе плітку і бардзюры. Між іншым, гэтыя «элементы гарадскога дэкору» — вельмі надзейныя пры перападах тэмператур. У прыватнасці, калі звычайная бетонная плітка пакрываецца льдом, пластыкавая — наадварот. Зразумела, пластык — ідэальны матэрыял і супраць вільготнасці, таму такая плітка і бардзюры даўжэй захоўваюць свае якасці. Яны вагой значна меншыя, ды і цана адрозніваецца ў бок памяншэння.

Пакуль завяршаецца ўзгадненне ўсіх неабходных дакументаў. У планах — выкарыстоўванне будаўнічых канструкцый уласнай вытворчасці для добраўпарадкавання тэрыторый каля смеццевых бакаў. Атрымліваецца двайная выгада. Аналагічнае ўжо паспяхова практыкуецца ў Гомелі. Але там больш пашырана вытворчая лінейка ўласнай прадукцыі.

Што датычыцца вынікаў дзейнасці прадпрыемства, то працуе яно з рэнтабельнасцю каля 3 % у год. У штаце каля 200 чалавек. Сярэдні заробак набліжаецца да 780 рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



Заглыбленыя кантэйнеры для смецця ў дварах горада.

Грамадзянская супольнасць

# Паслядоўніцы Ефрасінні

**Беларускі саюз праваслаўных жанчын пачне работу ў найбліжэйшыя месяцы. Устаноўчае пасяджэнне новага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання адбылося днямі ў Мінску.**

— Размовы наконт з'яўлення такой арганізацыі ў Беларусі хадзілі даўно. Былі розныя прапановы, кропкава ўзнікалі ініцыятывы. Напрыклад, у Віцебску ўжо даўно існуе абласное аддзяленне міжнароднага Саюза праваслаўных жанчын, — падзяліўся **старшыня Сінадальнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы па ўзаемадзеянні царквы і грамадства, протаіерэй Мікалай КОРЖЫЧ.** — Зараз настаў той самы момант, калі склалася ініцыятыўная каманда, гатовая без прамаруджвання ўзяцца за работу на рэспубліканскім узроўні. Гэта цудоўная навіна!

Плануецца, што арганізацыя аб'яднае намаганні праваслаўных беларусак для вырашэння праблем у самых розных сферах: ад духоўна-асветніцкай і культурнай да сацыяльнай і экалагічнай. Сярод задач — дабрачыннасць, адукацыйныя ініцыятывы, падтрымка жанчын і іх сем'яў у складаных жыццёвых сітуацыях, развіццё праграм па ўзмацненні здароўя нацыі і іншыя.

— Сёння надзвычай важна захаваць духоўна-маральную спадчыну, папулярызаваць традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, якія заставаліся нязменнымі амаль тысячагоддзе на нашай зямлі, аднак апошнім часам апынуліся пад пагрозай. А паколькі праваслаўная вера аб'ядноўвае многія народы па ўсім свеце, мы будзем імкнуцца і да ўзмацнення сяброўскіх адносін паміж прадстаўніцамі розных краін, — расказала **старшыня першага пасяджэння БСПЖ Таццяна БАРШЧЭЎСКАЯ.** — Акрамя таго, саюз будзе развіваць супрацоўніцтва беларускай праваслаўнай царквы з інстытутамі грамадзянскай супольнасці. Не на апошнім месцы сярод задач арганізацыі стаіць патрыятычнае выхаванне.

З вітальным словам да праваслаўных жанчын звярнуўся **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ПАВЕЛ:**

— Шматвекавая гісторыя царквы Хрыстовай сведчыць, што праваслаўная жанчына падараваныя ёй Богам таленты можа раскрыць не толькі ў сям'і і блізкім коле людзей, але і ў грамадскім служэнні. Адным з яркіх таму прыкладаў з'яўляецца жыццё Святой заступніцы Беларусі прападобнай Ефрасінні, ігуменні і князіні Полацкай, якая была ў роўнай меры і вялікай малітвенніцай, і вялікай працаўніцай. Яна сваімі рукамі перапісвала кнігі і тым самым пакінула след у гісторыі айчыннай культуры. Яна мірыла князёў, якія знаходзіліся ў стане вайны, а значыць, несла найважнейшае дзяржаўнае служэнне, узмацняючы сваімі справамі асновы грамадства і краіны. Постаць Святой Ефрасінні кажа пра тое, што справы праваслаўнай жанчыны ў гонар Бога могуць адыграць знакавую сацыяльную і гістарычную ролю.

Нягледзячы на тое што Беларускі саюз праваслаўных жанчын зараз знаходзіцца ў стадыі стварэння, цікавасць да яго ўжо праяўляюць з-за мяжы. Так, праўленне міжнароднага Саюза праваслаўных жанчын выказала жаданне падпісаць дамову аб супрацоўніцтве адразу пасля афіцыйнай рэгістрацыі БСПЖ.

**Ганна КУРАК.**

# Пачынаюцца авіярэйсы ў Талін

**Беларускі перавозчык адкрывае рэгулярныя палёты туды з 30 мая.**

Як паведаміла **спецыяліст па сувязях з грамадскасцю ААТ «Белавія» Анастасія НАВУМЕНКА,** рэйсы па маршруце Мінск — Талін — Мінск будуць адбывацца чатыры разы на тыдзень з вылетам з нашай сталіцы ў 8.50 па панядзелках, чацвяргах і ў 15.50 па аўторках і суботах з прыбыццём у міжнародны аэрапорт Таліна імя Ленарта Меры. Зваротны рэйс плануецца рабіць з вылетам у 10.45 па панядзелках, чацвяргах і ў 17.45 па аўторках і суботах з прылётам у Нацыянальны аэрапорт «Мінск» (час для аэрапортаў указаны мясцовы).

Кошт авіябілетаў у адзін бок — ад 93 еўра, уключаючы таксы і зборы, і ад 178 еўра — туды-назад. Білеты ўжо ў продажы. Палёты плануецца рабіць на камфартабельным авіялайнеры Embraer 175, які ўмяшчае 76 пасажыраў. Пералёт зойме адну гадзіну 15 хвілін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**